Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 32 Вільня, Аўторак 16 Сьнежня 1930 г. Год VI (XIV)

Беларуская Крыніца

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі:	„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—6 зл., на паўгода — 3 зл., на 3 месяцы — 2 зл..	Цана абвестак:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)	ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.	на 1-шай старонцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр.. на 4-ай — 40 грш. -- за радок дробнага друку ў аднэй шпальце
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.		

Беларуская трагедыя.

Уся беларуская гісторыя ад найдаўнейшых і да нашых часаў — гэта бадай адна вялікая трагедыя.

Беларускія землі заўсёды былі тэрэнам войнаў Масквы і Польшчы, а так-жа тэрэнам іх палітычнай і эканамічнай экспансіі.

Землі нашы зажывалі спакою і народ наш памысна жыў і разьвіваўся культурна і эканамічна толькі пад сьцягам „Пагоні“, за часаў Вялікага Княства Літоўска-Беларускага, у якім дружна працавалі на агульную карысьць Беларусы, Ліцьвіны, Украінцы і дружна баранілі сваю дзяржаву.

Але гэта памыснае палажэньне Беларусі трывала коратка. Доўгія-ж вякі жыцьця нашага народу — гэта адна вялікая трагедыя, адно цяжкое цярпеньне.

Гэту адвечную беларускую трагедыю бачым і сягоньня. Народ наш, пасьля доўгага занападу, сяньня прабуе паўстаць да жыцьця, але ў гэтай ягонай пробе, у ягоных жыцьцёвых натугах — яго муча тая-ж хвароба, тая-ж гістарычная трагедыя, вынікаючая з тых-жа: польскага і расейскага эгоізмаў, якія — рэч дзіўная — адносна Беларусі, сьведама, ці нясьведама, звычайна дзеяць солідарна.

Прыпамінае гэта нам сваечасную палітыку расейскую і нямецкую адносна Польшчы, калі яны заўсёды ў бедах Польшчы былі між сабой солідарны.

Пасьля распаду турмы народаў царскай Расеі, беларускі Народ па ўсіх кутках сваей зямлі сваю ахвоту да жыцьця выказваў нядвузначна. Разам з гэтым, як з-пад зямлі, паявіліся і яговыя „апякуны“.

Роля „сардэчных“ апякуноў польскіх адносна Беларусаў выявілася яскрава ў іхных адносінах да Беларускай Найвышэйшай Рады, да Слуцкага Паўстаньня і агулам да беларускай палітыкі, экономікі і асьветы.

Узноў-жа „мілыя“ праявы і расейска-бальшавіцкай палітыкі адносна нас спатыкаем у яе крывадушных, двулічных адносінах да беларускай нацыянальнай справы і ў яе ўрэшце фікцыйным будаўніцтве беларускай дзяржаўнасьці.

Усе-ж гэтыя, чыста фікцыйныя як польскай так і маскоўскай палітыкі „сардэчныя“ і „мілыя“ да Беларусі адносіны мелі месца звычайна тады, калі ей патрэба было здабыць сымпатыі беларускага народу і ўкалыхаць яго да згубнага супакою, да падтрыманьня палітыкі польскай, ці маскоўскай, і гэтым аслабіць яго яшчэ больш, далей паглыбляючы яго адвечную трагедыю. Калі-ж міналі эгоістычныя да Беларусі патрэбы з боку маскоўскага ці польскага, дык хаваліся і „апякуны“ і свайму гадунцу — Беларусі — паказвалі... каб-жа язык, а то звычайны кулак.

Сымбалям скрыжаваньня польска-расейскіх уплываў і інтарэсаў на беларускім народзе была нядаўная „Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада“, правадыры каторай, паддаючыся гэтым чужацкім уплывам, у рэзультаце выразна падзяліліся на два лагеры: адны сталі на старане Варшавы (Луцкевіч, Астроўскі і інш.), а другія на старане Масквы (Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі і інш.). Лёгічны-ж рэзультат гэтага для Беларусі дужа трагічны.

Сяньня ў Польшчы беларуская справа зьведзена да самых малых разьмераў. Гэта дзеецца якраз тады, калі ў польскую палітыку ўпрэгліся такія беларускія „тузы“, як Луцкевіч і Астроўскі.

А гэткая беларуска-польская палітыка чуткім рэхам адбіваецца так-жа на ўсходзе і ўдзяляецца палітыцы маскоўскай.

Як нясуць апошнія весьці, у Менску, у сэрцы Беларусі, пасаджаны ў вастрог цэлы рад выдатных беларускіх палітычных і культурных дзеячоў, паэтаў, пісьменьнікаў і людзей навукі. Камуністыя абвінавачываюць іх і жадаюць для многіх кары сьмерці, за іхны нацыяналізм і дэмократызм і... быццам за зносіны з белай Польшчай.

У Польшчы-ж, гаворачы мімаходам, Беларусаў надта часта падазраюць у зносінах з чырвонай Масквой.

Гэты-ж маскоўскі паход на беларускі Народ робіцца якраз тады, калі Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі і інш. некаторыя іхныя таварышы апошнім часам выразна занялі фронт маскоўска-бальшавіцкі.

Гэта далейшы цяг беларускай гістарычнай трагедыі.

З вышэйсказанага ясна відаць сапраўдная крыніца вялікай гістарычнай беларускай трагедыі, якая, калі самі Беларусы не апамятаюцца і калі „прыяцелі“ нашы яшчэ больш намі „заапякуюцца“, народ беларускі можа давесьці да... нацыянальнай сьмерці.

Але ў гэта мы ня верым. Мы верым, што жыцьцё мацнейшае ад сьмерці. Пасьля буры праясьніцца і пацяплее.

Станецца гэта аднак толькі тады, калі прынамсі большасьць беларускай інтэлігенцыі і народу зразумее, што беларуская палітычная думка і праца мусяць быць самастойныя, а не складовай часткай палітыкі польскай, ці расейскай.

Як найдалей мусіць быць беларуская палітыка ад крыніцы нашай гістарычнай трагедыі!...

Па выбарах.

Як адбыліся апошнія выбары і які іх рэзультат, ужо нашы чытачы ведаюць — і ведаюць можа лепш, як мы тутака седзячы ў рэдакцыі. Да нас з вёскі прыходзіць шмат вестак аб выбарнай „тактыцы“ рожных адзінак, але ці ўсё надрукуем? Лепш мы зьвернемся да тых вестак, якія знаходзім у іншых газэтах і з якіх мы можам прадставіць сабе агульнае паняцьце аб выніках апошніх выбараў.

Эндэцкая часопісь „Myśl Narodowa“ (№ 49) у стацьці „Польшча ў люстры выбараў“ даходзіць да тых вывадаў, што каб не беларуска-украінскія „крэсы“, дык „адзінка“ чулася-б дрэнна і большасьці не сабрала-б. У зах. і цэнтральнай, г. зн. у чыста этнографічнай Польшчы адзінка здабыла толькі 65 мандатаў, а эндэкі разам з цэнтралевам 103; у паўдзённай Польшчы, дзе люднасьць ужо мяшаная, адзінка бярэ 47 мандатаў, а эндэкі разам з цэнтралевам 27. Далей на ўсход, дзе люднасьць чыста беларуская, або ўкраінская перамога санацыі яшчэ большая, тутака адзінка забірае аж 55 мандатаў, пакідаючы толькі два іншым партыям (1 эндэкам у Вільні і 1 украінцам у Луцку). Пры гэтым газэта дадае, што „бяз сумніву, да такога выніку прычыніўся націск з боку адміністрацыйных уладаў“. Далей газэта прыходзіць да таго вываду, што на бел.-укр „крэсы“ ня трэба йсьці з лішне дэмократычнымі тэорыямі, там трэба ўрадаваць („жондзіць“).

Другая польская газэта „Lwowski Kurjer poranny“ (№ 352) затрымоўваецца над тым, як санацыя здабыла для сябе гэтулькі мандатаў! Газэта дзівіцца, што найбольшы процант галасуючых быў на ўсходзе і то па вёсках больш, чым па местах, а асабліва добра галасавалі вялікія і глухія вёскі... Там проста „адзінкі з неба плылі“. Аказалася, што беларусы і украінцы паказалі сябе большымі польскімі дзяржаўнікамі і патрыётамі, чым самыя палякі ў чыста этнографічнай Польшчы...

Украінская газэта „Діло“, апісываючы выбары на Валыні, даходзіць да вываду, што Валынь — гэта нейкі дзіўны і таёмны край. Там адзін раз галасуюць за украінцаў, другі раз за палякаў, трэці раз за камуністаў, ізноў за ўкраінцаў, ізноў за палякаў... Таёмная краіна! Ці трэба дзівіцца, што і апошнія выбары мелі таёмны характар і што найбольшым таёмствам (містэрыяй) была трансформацыя (вугравая перамена) выбарчай карткі“?

„Дзівіцеся людзі! — піша „Діло“. Галасавалі як мур на 11, а стаіць як мур „адзінка“. Дзівецеся і тыя, што сядзелі на печы. Сядзелі як мур на печы, а выглядае, што йшлі мурам да урны. Мусіць затым завуцца мандаты „мураванымі“.

Далей „Діло“ робіць слушную ўвагу, якая можа быць датасавана і да нашага краю. „Калі на 21 мандат 20 забірае адзінка, дык усё з пункту гледжаньня ўкладу сіл у парадку. Значна горш было-б, калі-б адзінка забрала толькі палавіну мандатаў. Тады магло-б гэта сьведчыць аб пэўных адменах у настроях украінскага насельніцтва“.

Тасуючы гэтыя словы да нас, мы можам сказаць: каб у нас адзінка ўзяла палавіну, або меншую часьць мандатаў, гэта сьведчыла-б, што беларускія масы сьведама кінулі свае галасы на адзінку. Але калі ўсе мандаты забрала адзінка, мы з пункту народнага можам спакайней глядзець і на вынік апошніх выбараў і на будучыню.

Калі-б у нас па ўсіх абводах былі мужы даверу, калі-б гэтыя мужы даверу вільна сядзелі пры выбарных урнах і ўважна сачылі за ўсім, што каля іх робіцца, калі-б урэшце магчымасьці агітацыі былі роўныя як для адзінкі так і для адзінасткі — то хто ведае, які быў-бы рэзультат выбараў! А цяпер нам астаецца сьцьвердзіць, што мы да такіх выбараў і да такога спосабу праводжаньня іх яшчэ ня былі падгатаваны. Да гэтага падгатаваньня наш народ можа дайсьці толькі пасьля доўгай і ўпорыстай грамадзкай працы.

—Р.

Складайце дэкларацыі на беларускую школу!

З газэт

Рожніца ў лічбах.

Украінская газэта „Діло“ (№ 270) падае рожніцу паміж лічбап галасоў адданых у абвадовай камісіі і лічбай, якая была атрымана акружною камісіяй у Стрыю. Восьжа гэтыя рожніцы часам аграмадны. І так: у абводзе Калуш II кінутых галасоў было 1212, а на пратаколах камі іі напісана 1412, у абводзе Калуш III кінута 1200, а на прагаколе 1500, у абводзе Нэбылів кінута 612, а на пратаколе 1112, у абводзе Новыця кінута 698, а на пратаколе 1698 і г. д.

Добра, што ў украінцаў ёсьць свая інтэлігенцыя па вёсках і свае адвакаты, якія ўсе недакладнасьці патрапяць дагледзіць. Добра было-б і ў нас праверыць згоднасьць запісаў з лічбай укінутых галасоў!

Антон Луцкевіч з кумпаніяй і Бр. Тарашкевіч.

У полёнофільскім „Народным Звоне“ (№ 6) увесь штаб полёнофільскага лагеру: Антон Луцкевіч, Радаслаў Астроўкі, Фабіян Акінчыц, Кузьма Крук і Сымон Кароль зьмясьцілі адкрытае пісьмо да Браніслава Тарашкевіча, у якім пытаюцца яго, ці сапраўды ён, Бр. Тарашкевіч, падпісываў тыя адозвы, у якіх неміласэрна лаюць камуністы ўсіх беларусаў, а найбольш полёнофілаў, аўтараў успомненага адкрытага пісьма.

З гэтага пісьма даведываемся, што ў часе прадвыбарнай агітацыі камуністычная арганізацыя ў Зах. Беларусі засыпала беларускія вёскі агітацыйнымі лістоўкамі, якія былі падпісаны прозьвішчам Бр. Тарашкевіча з дадаткам на некаторых — „старшыня Грамады“.

У адозвах гэтых лаючы аўтараў успомненага адкрытага пісьма ўжыты вось такія словы:

„Банда Луцкевічаў, Астроўскіх, Акінчыцаў, Крукоў, Каралёў, Міцкевічаў“, „Патрыярхі беларускае здрады“, „правакатары і найзаядлейшыя пракуроры Грамады“, „пагромшчыкі ўсіх беларускіх культ.-прасьветных арганізацыяў“, „платныя шпікі польскай дэфэнзывы“, „разбойнікі, арганізуючыя напады на Беларускі Сял.-Раб. клюб „Змаганьне“, „грабары сацыяльна-нацыянальнага вызваленьня руху працоўных Зах. Беларусі“, „інквізытары беларускага вызвольнага руху“, „беларускія Азэфы“, „правакатары і пагромшчыкі“, „обэр-сышчыкі“ і гэтак далей.

Тарашкевіч, як ведама, сваей ар'ентацыі не зьмяніў, а бышыя яго таварышы — аўтары адкрытага пісьма — зьмянілі ў бок сучасных польскіх урадаў.

Словам, быўшыя павадыры Грамады пайшлі выразна двума кірункамі. Адны ў бок маскоўскага бальшавізму, а другія ў бок польскай санацыі.

Дык няведама, ці пасьля такога раздваеньня калішняга супольнага лагеру — Тарашкевіч адкажа на пісьмо бел. сэнатараў.

Апостальская Сталіца і Англія цікавяцца выбарамі ў Польшчы і падзеямі ў Зах. Украіне.

Польская газэта „Nowe Życie“ (№ 93) падае за газэтай „Polonia“, што брытанская амбасада ў Варшаве атрымала загад ад свайго ўраду прыгатаваць спэцыяльны рапарт аб варунках, у якіх адбыліся выбары ў Польшчы ў Сойм і Сэнат.

Тая-ж газэта падае, што ў хуткім часе маюцца прыбыць у Польшчу спэцыяльныя дэлегаты Апостальскай Сталіцы дзеля пазнаньня ўсяе гэтай справы на месцы. У сувязі з гэтым урад рабіў захады, каб Апостальская Сталіца, якая зацікавілася і варункамі арыштаў паслоў пасаджаных у турму ў Берасьці, не прысылала ў гэтай справе дэлегатаў. Дзеля таго, што захадаў ураду Апостальская Сталіца не паслухала, амбасадар польскі пры Ватыкане Ул. Скрынскі будзе ў хуткім часе адкліканы і гэнае становішча дэмонстрацыйна праз некаторы час ня будзе абсаджана.

Украінская газэта „Новий Час“ (№ 140) падае за польскімі газэтамі („Gazeta Poranna“ і „Robotnik“), што Ватыкан зацікавіўся апошнімі падзеямі ў Галіччыне (карныя экспэдыцыі ў украінскіх сёлах) і ў зьвязку з гэтым мае прыехаць у Галіччыну дэлегат Апостальскай Сталіцы.

А—гель.

Камунікат

Цэнтр. Ураду Бел. Інстыт. Гасп і Культ.

Да ўсіх гуртКоў Інстытуту.

Цэнтральны урад Б. І. Г. і К. гэтым давадзіць да ведама ўрады ўсіх гурткоў Інстытуту, што з пачаткам новага 1931 г. трэба ажывіць дзейнасьць Інстытуту. З гэтай мэтай: 1) у студні месяцы трэба сабраць агульныя сходы сяброў і перавыбраць урады.

2) Зараз пасьля агульнага сходу напісаць у Цэнтралю паведамленьне аб складзе новага ўраду; пераслаць імёны і прозьвішчы ўсіх сапраўдных сяброў гуртка.

3) Цэнтральны Урад паводле прысланага сьпісу вышле ўсім сябром новыя білеты. Старыя білеты ад 1 сакавіка (марца) трацяць сваю сілу і будуць лічыцца няважнымі.

4) прысылаць у Цэнтралю заказы на значкі Інстытуту (цана кожнага значка 1 зл. 50 гр.)

5) Цэнтральны Урад заахвочвае гурткі да больш энэргічнай дзейнасьці ў справе складаньня школьных дэклярацыяў, ладжаньня тэатральных прадстаўленьняў, лекцыяў, пашыраньня беларускага друкаванага слова і г. д.

6) З гэтай мэтай Цэнтральны Урад па Новым годзе разашле бясплатна гурткам кніжкі юбілейнага выданьня „Дудку Беларускую“ і „Смык Беларускі“ Фр. Багушэвіча, а так-жа характэрыстыку творчасьці Фр. Багушэвіча напісаную кс. Ад. Станкевічам.

Урады гурткоў павінны паведаміць Цэнтралю: 1) колькі экзэмпляраў кніжак трэба ім выслаць дзеля пашырэньня ў народзе, 3) колькі прыслаць у гурток газэт і якіх?

Кожны гурток у сваім інтарэсе павінен парупіцца, каб скарэй прыслаць заказ на кніжкі, бо колькасьць кніжак для бясплатнай рассылкі агранічана.

Цэнтральны Урад Бел Інстытуту Гаспадаркі і Культуры.
Вільня, Людвісарская 1—19.

Ад. Клімовіч.

Францішак Багушэвіч як паэт і грамадзянін*)

> „Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, — так як той чалавек прад скананьнем, катораму мову займе, — а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце мовы нашай беларускай...“ („З прадмовы“ да „Дудкі беларускай“).

Мінула сёлета трыццаць гадоў ад часу, калі выпусьціў з рук ліру сваю Вялікі Сын Беларусі і сапраўдны Бацька нашага Адраджэньня Францішак Багушэвіч, аўтар праслыўшых на ўсю Беларусь і нават далёка за ейныя межы „Дудкі“ і „Смыка Беларускага“, падпісаных прыбранымі прозьвішчамі Мацея Бурачка ды Сымона Рэўкі з-пад Барысава. Гэты юбілей панукае, а нават змушае нас да паноўнага, хоць-бы найкарацейшага застанаўленьня над тым, хто быў Багушэвіч і якая ягоная заслуга ў беларускім адраджэньні?

Коратка: Фр. Б. паходзіць з беларускай спольшчанай шляхты. Радзіўся ў ф. Кушлянах каля м-ка Жупран, у Ашмяншчыне, у 1840 годзе. Сярэднія навукі здабыў у Вільні, а на вышэйшыя выехаў у Пецярбург, дзе запісаўся на фізыка-матэматычны факультэт. З няведамых дагэтуль прычын Багушэвіч прарывае свае навукі ў Пецярбурзе і зьяўляецца ў Ашмяншчыне, дзе працуе як народны настаўнік. Тут-жа застала яго паўстаньне 1863-га году, у якім бярэ чыннае ўчасьце; раненага ў нагу Багушэвіча хаваюць ад вока царскіх чыноўнікаў сяляне. Па выздараўленьні Багушэвіч ня чуецца аднак пэўным у родным краі і выяжджае на Украіну, паступае ў Нежынскі юрыдычны Ліэцэй, які канчае ў 1868 г. Праз даўжэйшы час пасьля гэтага астаецца працаваць там-жа, на Украіне, як судзебны сьледавацель. Пазнаецца пры гэтым яшчэ больш з украінскім народна-адраджэнскім рухам, з якім, бяз сумліву, мусіў ужо спаткацца і зазнаёміцца ў Пецярбурзе... Пад старасьць,—а памёр маючы 60 гадоў, — вяртаецца Багушэвіч на Бацькаўшчыну і, асеўшы ў Вільні, працуе пры тутэйшым Акружным Судзе як адвакат. Памёр Фр. Багушэвіч 15-га красавіка 1900 г. і пахаваны на парахвіяльных могілках у родных сабе Жупранах.

Гэтулькі ўсяго маем даных аб жыцьці Фр. Багушэвіча, хоць месца і час, які нас дзеле ад ягонай сьмерці, параўнаўча гэтак яшчэ блізкі, гэтак кароткі. Паўтарыўся тут сумны лёс — хто ведае, ці апошні — вялікіх людзей, якія жарам сэрцаў сваіх запалялі цэлыя пакаленьні, але незразумелымі асталіся для сваіх нават найбліжэйшых, бо для сваей сям'і. Так. Радня Багушэвіча (сын і жонка памерлі ў 1929 г.) асталася чужой і глухой для вялікіх ідэалаў свайго Родзіча і, паміма просьбаў, адмовілася ня толькі аддаць, але нават і заглянуць у спадчыну рукапісаў нябожчыка. Вельмі гэта ўтрудняе работу над дальшымі досьледамі творчасьці Багушэвіча: мы сяньня ня ведаем нават, да якой пары жыцьця поэта трэба аднесьці напісаньне ім апублікаваных твораў у „Дудцы“ і „Смыку“. А быў-бы гэта паважны крок наперад, бо разьвеіў-бы туман не над адным пытаньнем, спавіваючым сяньня цень Вялікага Юбілянта.

Мо' будучыня будзе ў гэтым кірунку мець больш шчасьця, чымся сумная прошласьць і невясёлая сучаснасьць: дай Божа! У кожным выпадку сяньня можна і трэба выразіць просьбу, а нават жаданьне да беларускіх літэратурных дасьледчыкаў, каб у справе рукапіснай спадчыны літэратурнай па Багушэвічу рук не апускалі. Не ўдалося раз, але хто ведае, які быў-бы вынік, каб нехта папрабаваў прабіцца да рукапісных тайнаў Багушэвіча раз другі, трэці... дзесяты. Усё на сьвеце мяняецца. Мяняюцца людзі, мяняюцца і настроі. А ў людзях ужо перамена сталася.

Дык надзеі траціць нельга, а набліжаючыяся сотыя ўгодкі нарадзінаў Багушэвіча (1840-1940) заслуговывалі-б на апублікаваньне калі ня ўсіх рукапісаў ягоных, дык прынамся тых, што сяньня загрожаны пылам забыцьця ў архівах нават даступных. Мова тут перадусім аб „Скрыпцы беларускай“ ды іншых драбнейшых творах Багушэвіча, расьціданых у народзе ў рукапісах, ці нават і друкаваных у паасобных часопісях. Усё гэта дагэтуль парасьцярушана і на сотыя ўгодкі нарадзінаў Багушэвіча мусіла-б быць сабрана і ўдаступлена найшырэйшым народным масам.

Пераходзячы да праграмовай на сягоньня ацэнкі Багушэвіча, як паэта, нельга памінуць трапных спасьцярогаў ягонага крытыка Ад. Станкевіча, які між іншым кажа:

> „І рэч дзіўная—Багушэвіч так пранятьі горам народу, што струн ліры яго не кранулі ані краса прыроды, ані чары жаночага каханьня. Два гэтыя жаролы, якія звычайна даюць шмат натхненьня для поэтычнай творчасьці, Багушэвіча ня ўзрушылі; ...самастойнага мейсца для прыроды ў творах Багушэвіча не знаходзім. Матываў-жа аб жаночым каханьні сусім там не спатыкаем“.

> „Жанчыну Багушэвіч малюе з пункту грамадзка-этычнага. Ён востра высьмейвае і ганіць жанчыну за яе зводніцтва і шкодную языклівасьць („Гдзе чорт ня зможа, там бабу пашле“ і „Быў у чысцы“) і з глыбокай спагадлівасьцяй адносіцца да ўдавы і цяжкой удовінай долі („Удава“), а так-жа з вялікім пачуцьцём пашаны малюе жанчыну, як матку і патрыётку („Калыханка“).*)

*) Рэфэрат прачытаны на Акадэміі, якую ладзіў Бел. Інст. Гасп. і Культуры дн. 7. г. м. у салі пры касьц сьв. Мікалая ў Вільні.

*) Ad Stankiewič: Franciš Bahuševič, Jaho žyćcio i tvorčaść (Krytyčny narys), Wilnia, 1930 h, бачына 43.

Арышты беларусаў у Радавай Беларусі.

У прошлым нумары мы пісалі аб арыштах беларускіх дзеячоў у Усходняй часьці Беларусі, якая акупавана маскоўскімі камуністамі.

Гэта былі ня чуткі, а факт, які пацьвярджаецца і самымі акупантамі Беларусі ў іх газэтах, як „Зьвязда“ і „Правда“.

Гэтыя-ж самыя савецкія газэты падаюць, што арыштаваныя — ведамыя беларускія дзеячы: б. старшыня Беларускай Народнай Рэспублікі Ластоўскі, Цьвікевіч, Смоліч, Красkоўкі, Лёсік, Некрашэвіч, б. камісар земляробства Прышчэпаў, Адамовіч, Гарэцкі, І. Савіцкі, пісьменьнікі Дудар, М. Зарэцкі, Пушча і інш.

Пасьля арыштаў работнікі на фабрыках па загаду камуністаў пачалі дамагацца ў „сваіх“ рэзалюцыях для арыштаваных беларускіх дзеячоў кары сьмерці.

Дзеля таго, што сярод арыштаваных знаходзяцца і беларускія пісьменьнікі, загаварылі аб арыштаваных і „пралетарскія пісьменьнікі“, якія так-жа па загаду з гары дамагаюцца для беларускіх пісьменьнікаў кары сьмерці. Гэнае выступленьне „пралетарскіх пісьменьнікаў“ падпісавае прозьвішчамі: Юдэльсон, Бронштэйн, Пфляумбаум, Вітэнзон, Лівшыц і другімі.

З Беларускага жыцьця.

ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Культурная праца. Пад кіраўніцтвам Беларускага Істытугу Гаспадаркі і Культуры пачалася ў Вільні культурная праца ў наступным парадку:

У памешканьні Інстытуту — Людвісарская 1-19 — ў гэтым месяцы адбыліся і яшчэ адбудуцца гутаркі і дыскусіі на тэмы:

9 сьнежня а гадзіне 8 увечары — аб славянскіх плямёнах, пад кіраўніцтвам студ. М. Пяцюкевіча; 11 сьнежня — аб гаспадарцы, пад кіраўніцтвам інж. А. Клімовіча; 16 сьнежня — аб узгадаваньні характару, пад кіраўніцтвам студ. Б. Кляпацкага; 18 сьнежня — аб гігіене, пад кіраўніцтвам абсольв. мэдыцыны Т. Куніцкага.

Апрача вышэйсказанага адбываецца два разы на тыдзень навука сьпеву народных песьняў і песьняў рэлігійных пабеларуску, пад кіраўніцтвам Я. Пазьняка.

Уваход на гэтыя гутаркі і дыскусіі вольны і бясплатны, як для моладзі так і для старэйшых. Так-жа вольны доступ кожнаму, хто мае ахвоту пяяць, і да навукі беларускіх народных песьняў і песьняў рэлігійных пабеларуску.

Бібліатэка-чытальня ў Вільні. Бібліатэка-чытальня Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, якая месьціцца пры вул. Людвісарскай 1 (уваход праз беларускую кнігарню „Пагоня“) адчынена штодня, апрача нядзеляў і сьвятаў ад гадзіны 3 да 5 па паўдні. Кніжкі і газэты да чытаньня даюцца бясплатна. Бярэцца залог за кніжкі, калі чытач бярэ кніжку з сабой.

Бібліятэкай-чытальняй кіруе паручнік Казлоўскі.

Новы гурток Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. У мінулым тыдні заргапізаваўся ў в. Задвор'е, Стаўпецкага пав. новы гурток Бел. Інст. Гасп. і Культуры.

БЕЛАРУСЫ Ў ЧЭХАСЛАВАЧЧЫНЕ.

Беларуская Рада ў Празе. Дня 22 лістапада с. г. адбыўся гадавы сход Беларускай Рады ў Празе Чэскай, на якім між іншымі справамі арганізацыйнага характару выбраны ўрад Рады ў наступным складзе: старшыня — М. Вяршынін, віц.-старш. А. Калоша, сэкрэтар — М. Вітушка. Рэвізыйная камісія: П. Астапкевіч, Ян Сак і Л. Гірыс.

У **Празе** чэскай выйшла з друку і паступіла ў продаж кніжка п. н. „Беларусь і Беларусы“, якую пачэску напісаў сучасны вучыцель Віленскай Беларускай гімназіі Др. М. Ільяшэвіч. Кніга прызначана для інфармаваньня чэскага і наагул пачэску разумеючага грамадзянства аб беларускіх справах і абымае матэрыял географічна-антраполёгічны, гістарычны, па часьці палітычны і літэратурны. У тэксьце кнігі — кніга мае 124 бачыны — ёсьць 13 розных ілюстрацыяў і этнографічная карта Беларусі. У дадатку 10 вершаў, 1 апавяданьне прозай і 5 казак — усё у чэс ім перакладзе. Цана кніжкі ў Польшчы 3 зл. і дастаць яе можна праз кожную беларускую кнігарню ў Вільні.

З РАДАВАЙ БЕЛАРУСІ.

Грамадаўцы Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Бурсэвіч і Грэцкі ўжо ў Радавай Беларусі.

З Украінскага жыцьця.

Звальненьне з вастрогу ўкраінскіх паслоў. Дасюль звольнены з вастрогу ўкраінскія паслы: Яворскі, Кузык і а. Пэлліх. Будзе так-жа звольнены за каўцыю і пралат Куніцкі. Д-р Д. Левіцкі за кратамі яшчэ сядзіць.

З Польшчы.

Фармальная зьмена ўраду. У апошнія часы, пасьля выбараў, зьмяніўся ў Польшчы ўрад. Пілсудскі з цэлым габінэтам падаўся ў адстаўку, а Прэзыдэнт назначыў старшынёй міністраў В. Слаўка, які ўтварыў новы ўрад амаль з тымі-ж міністрамі, якія былі ў габінэце Пілсудскага.

Гэная зьмена ўраду не азначае ніякае зьмены курсу палітыкі.

Адкрыцьце Сойму і Сэнату. Дня 9 г. м. адкрыта сэсія Сойму і Сэнату. На маршалка Сойму выбраны д-р Сьвітальскі (ББ.), на маршалка Сэнату б. віленскі ваявода Рачкевіч (ББ.).

Паліцэйскія засуджаны за біцьцё. У Катовіцах акружны суд засудзіў двух паліцэйскіх за біцьцё пры дапросах на 3 месяцы турмы.

Беларускія календары на 1931 г.

У ва ўсіх беларускіх кнігарнях прадаюцца беларускія адрыўныя календары: „Беларускага Выд. Т-ва“ — па 1 зл. 25 гр.

Выдавецтва „Культура“ — па 95 гр.

Іншы, на слова ўзяты, крытык літэратурны праф. Піотуховіч чапаючы гэтысамы бок творчасьці кажа: што ў Багушэвіча

„моцна гучэлі толькі струны грамадзкага абурэньня, для іншых, больш пяшчотных мэлёдый гэта ліра была глухая. Ня ў постаці пекнай і прыгожай дзяўчыны з вянком на галаве, з пахнючымі кветкамі ў руках становіцца прад намі муза паэты, але ў постаці нейкай схімніцы, дабравольна прыняўшай на сябе вялікі ўчынак апяваньня народнага гора. Ад твораў Багушэвіча павявае нейкім духам мастацкага асцэтызму“.*)

Што датыча вонкавага боку поэтычнай творчасьці Багушэвіча, дык крытыка згодна прызнае яму чыстасьць мовы як на свае часы, дзіўную вобразнасьць і сымболіку (Вершы: „Хмаркі,“ „Калыханка“, „Мая хата“ і інш).

Разглядаючы форму верша Багушэвіча, нябошчык К. Сваяк**) прыходзіць да вываду, што найлепш яму ўдаюцца творы на лад народнай песьні.

З іншых формаў вершу Багушэвіча трэба зазначыць сатыру („Сватаныя“, „Панскае ігрышча“, „Дзе чорт ня зможа, там бабу пашле“), жарт, байку „перасыпаныя буйна народнай пагаворкай, параўнаньнем, прыкладам***).

Гэтулькі аб Багушэвічу як паэце, ці лепш, аб тэхніцы ягонага вершу.

Незраўнана больш можна і трэба сказаць аб Багушэвічу, як грамадзяніне. Асабліва сягоньня ў час бязспрэчнай прыгнячонасьці актыўнай думкі беларускай, бо праўду трэба прызнаць за крытыкай, якая кажа,

„што ідэалы дадзеныя нам Фр. Багушэвічам ...актуальныя і цяпер... Ды і ня скора зьмест твораў яго вычарпаецца. Станецца гэта толькі тады, калі народ беларускі дасягне... усестаронную сваю нацыянальную самабытнасьць.“*)

*) Праф. М. Піотуховіч — Нарысы Гісторыі Беларускай літэратуры, частка І. Менск 1928 г. бач. 102

**) Kaz Swajak: Bahušewič — piaśniar biełaruski. „Krynica“ 1920 h Nr 2—5.

***) Ad. Stankiewič там жа, бачына 44—46.

Гэтую трывалкую актуальнасьць Багушэвічавых ідэалаў сапраўды памастацку ўняў іншы віртуоз беларускага слова Максім Гарэцкі, які, здыстансаваўшы Багушэвіча з ягонымі папярэднікамі, кажа, што

„і сярод пазьнейшых за яго нашых песьняроў — калі і ёсьць колькі іменьняў дужэйшых за яго па здольнасьці чыста пясьнярскай, дык роўных яму па нацыянальна-социяльнай самабытнасьці пакульшто не зьявілася і ўсе ідуць па тору, дзе яго сьлед быў першы і наўдужэйшы. Багушэвіч сьціраваў нашу літэратуру на пэўны натуралістычны шлях і зьвязаў яе з народам“**)

Але, „зьвязаў з народам“ і таму народ зразумеў Багушэвіча, таму творы ягоныя дасталіся і пад найніжэйшую страху беларускую, таму пабудзілі да працы, да ахвярнасьці першы легіон беларускай самаўсьведамляючайся інтэлігенцыі, ад каторага мы, малодшае пакаленьне, вядзём свой радавод.

Але бліжэй да справы. Багушэвіч у працы штодзеннай сваей, як судзьдзя, як адвакат, меў бяз ліку магчымасьцяў пазнаць найдальшыя, найглыбшыя закуткі душы беларускай. Як паэт, умеў гэта адчуць і пераказаць, як дазнаны праўнік, як практык жыцьцёвы патрапіў сабраны матэр'ял аформіць, упарадкаваць. Гэта апошняя ўласьцівасьць мусіла-б закваліфікаваць Багушэвіча ў рады паэтаў—рэалістаў, бяручых і падаючых рэчы і здарэньні так, як яны сапраўды ў жыцьці праводзяцца. Няжыцьцёвых утопіяў у Багушэвіча няма.

Багушэвіч—паэт бачыў і адчуваў патрэбу вясьці Беларуса простай дарогай да ўсестароннай незалежнасьці, але Багушэвіч — жыцьцёвы практык, Багушэвіч рэаліст бачыў і разумеў, што час да гэтага йшчэ не надышоў. І хоць кіпеў у душы ад узбурэньня над соцыяльнай несправядлівасьцю, хоць бачыў зьдзек над нацыянальным самапачуцьцём Беларуса, тож аднак ня кліча народ на вуліцу да самараспраывы, але вобразна гэты народ толькі навучае. Паказуе ня гэтулькі бяду, колькі прычыну гэтай бяды, цемнату: „а гдзе-ж кніга для вас мужыкоў?“ Бачам тут пекную рысу Багушэвіча, ня толькі Бацькі, але і разумнага вучыцеля Народу.

*) Ad Stankiewič: там-жа.

**) М. Гарэцкі: Гісторыя беларускай літэратуры. Вільня.

Трудна і ў найкарoтшых нават словах паказаць на ўсе рысы, на ўсе мамэнты усьведамляючай, будуючай, узгадоўліваючай чыннасьці Багушэвіча. Усё гэта, як аснаўныя падставы народнага адраджэньня, павязана з сабой у адну цэласьць і кожны з вершаў Багушэвіча, — гэта люстра Беларусі.

„Кепска мая хатка, падваліна згніла
І дымна і зімна, а мне яна міла“.

Вецер жыцьця разносіць найлепшых сыноў Бацькаўшчыны ў далёкую чужыню, але паэт вера, што

„..рана ці позна, тыкі мне здаецца,
кожны занудзіцца, да дому прыб'ецца.“

Маці над калыскай сына, які станецца мо' калісь „вялікім панам“ і здрадзіць свой народ, маці такога сына

„жабруючы пойдзе ў вёску,
будзе прасіць Матку Боску,
каб забыцца ей аб сыне,
каб ня ведаць, дзе ён згіне“.

Штогод і штодня беларускія сыны, ідучы ў найміты да чужынцаў, нясуць

„усяму жыцьцё,
сабе толькі крэс.“

Бязпрыкладную ў гісторыі стойкасьць Беларуса ў веры і тоў стойкасьць разумную а ня нейкую фанатычную падае Багушэвіч у бязсьмертных „Хрэсьбінах Мацюка“, у „Сваей зямлі“.

На асаблівую ўвагу заслугоўвае талент Багушэвіча да вобразнасьці ў пераносах. Прыкладам хоць-бы такая „Воўк і авечка,“ дзе пад віцам авечкі крыецца несьвядо-

З заграніцы.

Бальшавікі ўсё шукаюць віноўнікаў няўдачы ў сваей унутранай гаспадарцы. Дзеля таго, каб з сябе зваліць віну за няўдалую гаспадарку пры праводжаньні „пяцілеткі", падшуківаюць людзей — „казлоў адпушчэньня" — і судзяць іх, як віноўнікаў у „вредительстве" праводжаньня камуністычнага гаспадарчага пляну.

Гэткі суд адбыўся каля двух гадоў таму пад назовам „шахтынскага працэсу", які закончыўся прысудам на сьмерць некалькіх асоб, а цяпер адбыўся ў Маскве гэткі-ж суд над 8 асобамі пад назовам „працэс шкоднікаў прамысловай партыі".

У гэтым працэсе бальшавіцкі суд засудзіў 5-ох падсудных на сьмерць, і 3 ох на 10 гадоў катаргі.

Пасьля прысуду, Ц. В. К. „зьлітаваўся" над нявінна засуджанымі і замяніў ім кару сьмерці 10-ці гадовай катаргай.

Акадэмія ў чэсьць Фр. Багушэвіча.

У нядзелю 7 г. м. Цэнтральны Ўрад Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ладзіў урачыстае сьвяткаваньне 30-ых угодкаў сьмерці **вялікага Беларуса, паэта народніка, бацькі сучаснага беларускага народнага адраджэньня Францішка Багушэвіча,**

Акадэмія адбылася а гадзіне 6 у вечары ў салі пры касьц. сьв. Мікалая.

На Акадэмію зышлося шмат віленскіх беларусаў, якія разумеюць Багушэвіча і імкнуцца да ідэалу, аб якім пясьняр за жыцьця свайго, яшчэ ў 1892 годзе, пачаў пяяць беларускаму народу на сваей дудцы.

На гэту Акадэмію прыбыў і асабісты прыяцель Фр. Багушэвіча п. Зыгмунт Нагродзкі, які за жыцьця Багушэвіча працаваў разам з песьняром у справе палепшаньня долі народу нашага краю.

Акадэмію адкрыў кароткай прамовай старшыня Бел. Інст. Гаспад. і Культуры кс. В. Гадлеўскі.

Рэфэрат прачытаў аб Фр. Багушэвічу інж. А. Клімовіч на тэму „Фр. Багушэвіч як паэт і грамадзянін".

Пасьля рэфэрату інж. Клімовіча, мастак Я. Драздовіч расказаў прысутным аб усіх памятках аб Фр. Багушэвічу, якія яму ўдалося сабраць, а так-жа паказаў некаторыя з гэтых памяткаў, якія ён—Драздовіч—змог утрываліць сваей мастацкай працаю у прыгожых рысунках.

Вельмі цікавыя і цэнныя успаміны аб Фр. Багушэвічу выявіў асабісты прыяцель песьняра п. Зыгмунт Нагродзкі, які прадаклямаваў пару вершаў Багушэвіча, якія яшчэ нідзе не друкаваны. Пры гэтым п. Нагродзкі перадаў Б. Інст. Г. і К. некалькі цэнных фатаграфіяў з жыцьця песьняра.

Пасьля рэфэрату і ўспамінаў аб Юбілянце, гімназістка А. Шутовічанка і студэнт Я. Малецкі прыгожа прадэклямавалі некалькі Яго вершаў, якімі пясьняр будзіў і будзіць беларускі народ да поўвага народнага жыцьця.

На заканчэньне ўрачыстасьці прысутныя з належнай павагай прапялі беларускі народны гімн „Не пагаснуць зоркі ў небе".

п-к.

Адказ на „рэвалюцыі" А. Стэповіча.

Альбін Стэповіч, які за ўсялякую цану стараўся пасядзець яшчэ на выгадным яму пасольскім крэсьле і калі дапяць гэтага асабістага шчасьця не ўдалося, цяпер пачаў шукаць таго, што згубіў, — гэта грамадзкую чэсьць.

Б. Х. Д. ўзьвяла А. Стэповіча на вышыню грамадзкай павагі, але ўзьвёўшы на гэную вышыню патрэбавала ад яго, каб апраўдаў сябе — патрэбавала працы на беларуска-грамадзкай ніве. А. Стэповіч даверу, які быў яму даны, не апраўдаў, для яго грамадзкая справа амаль не існавала і гэтым паказаў, што на становішчы беларускага пасла ён зусім не на месцы.

Дзеля гэтае прычыны Цэнтр. улада БХД пастаралася пасадзіць Стэповіча, яшчэ як сябру партыі, на адпаведнае яму месца і не праводзіць больш у паслы.

Стэповіч з гэткай пастановай партыі згадзіцца не хацеў і пачаў шукаць для сябе шчасьця, прыбіраючыся ў назоў „радыкала".

Калі-ж пасольскага мандату не дасягнуў, каб апраўдаць сябе прад грамадзянствам, пачынае пісаць у полёнофільскі „Народны Звон" безсэнсоўнага зьместу „рэвалюцыі", мусіць толькі дзеля таго, каб хоць там, сярод полёнофілаў, знайсьці сабе пашану, прыхільнасьць і спагаднасьць.

Што датыча зьместу Стэповічавых „рэвалюцыяў", дык яны настолькі наіўныя, што адказываць на іх — уважаем—зусім лішнім. Адно толькі прыходзіцца сьцьвердзіць, што А. Стэповіч не разумее ці ня хоча зразумець нават таго, што ўспомнены ім дагавор абавязывае абедзьве стараны, калі-ж адна старана дагавору не датрымае, тады той дагавор не абавязвае стараны другой, а дагавор-жа, аб якім піша Стэповіч, сарваў ён сам сваей адозвай поўнай няпрыстойнай лаянкі.

Але гэта ўжо пераж**ы**та. Адно толькі скажам А. Стэповічу: ня тою дарогаю вы шукаеце для сябе згубленай грамадзкай чэсьці. Пашана ў народзе здабываецца карыснай для яго працай. Папрабуйце, папрацуйце чэсна і шчыра дзеля дабра народу беларускага, а народ Вашу працу напэўна ацэніць.

Пісьмо ў Рэдакцыю.

Паважаны гр. Рэдактар!

Не адмоўце надрукаваць ніжэй пададзенае.

З прычыны бандыцкага нападу на віцэстаршыню Б. Х. Д. гр. Якіма Красоўскага, выражаю гр. Красоўскаму свой шчыры спагад у яго цярпеньнях, а так-жа жаданьне найхутчэйшай паправы здароўя. Спадзяюся, што гэны бандыцкі напад знойдзе шырокі водгук у масах беларускіх і гэтым выкрые напастнікаў дзеля належнага іх пакараньня.

Прыміце словы шчырай прыязьні.

Іказьнь. 10-XII. М. Дварэцкі.

Да ведама ўсіх падпішчыкаў, супрацоўнікаў і чытачоў „Бел. Крыніцы."

Наша газэта часта атрымлівае ад сваіх падпішчыкаў, супрацоўнікаў і чытачоў скаргі, што неакуратна атрымліваюць „Бел. Крыніцу". Вось-жа паведамляем усіх, што мы газэту высылаем акуратна, толькі неакуратна яе даручаюць. А неакуратна даручаюць з дзьвюх прычын: або гінуць на пошце, або пададзены неакуратна адрас. Гэту другую прычыну трэба канечне адсунуць, каб лепей змагацца з першай. Дык просім усіх нашых падпішчыкаў прысылаць у рэдакцыю **дакладны** свой адрас, у каторым **выразнымі літарамі** была-б пададзена **пошта**, з якой атрымліваеце газэту, **вёска** ці мястэчка, можна і павет, дзе жывіцё, **імя і прозьвішча.** Хто да Новага году ня прышле нам свайго дакладнага адрасу, таму газэту прымушаны будзем спыніць.

Паведамленьні да нас можна пісаць так:

Прашу ня спыняць мне газэту „Б. Крыніцы" і прысылаць яе надалей. Мой адрас: пошта . . . . вёска . . . імя і прозьвішча . . гміна . . . павет . . .

Пісьмы адрасаваць да нас так: **Wilno, Ludwisarska 1—19, „B. Krynica."**

Наша пошта.

Крывічу. За прысланае дзякуем, скарыстаем, скарыстаем на пазьнейшы час, пішыце.

Падпішчыку № 1060. З карэспандэнцыі скарыстаем. У справе недаручэньня газэт напішыце скаргу на солтыса, апісаўшы факты, і прышліце да нас, а мы перашлём у дырэкцыю пошты.

М. Чэрняку. Скарыстаем, друкі выслалі, пішыце больш.

П. Асіповічу. Пакрывайце расходы прадстаўленьня з выручаных грошай без адлічкі 20 процантаў для Цэнтралі.

Мішуку. Газэту будзем пасылаць за прысланыя грошы і ў 1931 г.

Грошы атрымалі: ад Я. Ключніка 2 зл., Э. Карпенюк 3 зл. і Г. Вжосінскага 5 зл. — дзякуем.

масьць нацыянальная нашага народу, якая аднак часта бывае толькі зданлівай, бо

„і авечка, хоць дурная,
а ваўка усё-ж пазнае."

Цэлыя томы працаў асьвятляючых працэс выкрыўляньня народнай душы беларускай у польскі ці маскоўскі бок Багушэвіч вобразна зьмяшчае ў невялікіх, ужо успомненых „Хрэсьбінах", якія заканчывае славамі:

„Вось так то хрысьцілі мяне казакі
З тутэйшага ды ў палякі."

А старана чыста соцыяльная. Тут Багушэвіча „Гора", тут „Немец", тут „Як праўды шукаць", „Вастрог", тут урэшце бязсьмертная „Ня чурайся".

Колькі сілы, колькі праўды ў гэтых вершах, але ні каплі дэмагогіі. Слушна кажа Ад. Станкевіч, што „Багушэвіч надта мала заклікае да чыну, але затое надта шмат што народу разьясьняе."*) Адзінае, да чаго Багушэвіч найвыразьней заклікае, гэта „захаваць мову сваю беларускую", каб не памерці.

Багушэвіч, поўны жыцьцёвага дазнаньня, нігдзе не зракаецца Бога і ў аснове існаваньня кожнага народу відзіць Волю Божую:

„Наша мова для нас сьвятая, бо яна ад Бога нам даная, як і іншым добрым людцам"...

Багушэвіч як вызнавальнік позытыўнай веры,

„каб грэху не баяўся
Ці ў пятлю палез-бы, ці ў ваду схаваўся-б."

Беды і няшчасьці ломяць душу паэта, але ён пад гэтым цяжарам ня ўгінаецца, бо

„душа-ж ня гліна!...

*) Ad Stankiewič: тамжа.

На бяду мне плюнуць, Богу памаліцца
Да слушнага часу дажыву як трэба."

Сынтэзу ўсяго сьветапагляду свайго замыкае Багушэвіч у вершы „Ахвяра":

Маліся-ж бабулька да Бога,
Каб я панам ніколі ня быў:
Каб людзей прызнаваў за братоў,
Каб за край быў умерці гатоў,
Каб ня прагнуў айчыны чужых.
Каб я Бога свайго не акпіў,
Каб ня здрадзіў за грошы свой люд,
Каб свайго я дабра не прапіў
І візашто ня меў чужы труд!"...

Вось Багушэвіч як цэласьць. Трудна жадаць ад уломнасьці людзкой нечага больш! І на сягоньня, як гадоў сорак таму назад, Багушэвіч так жывы і так актуальны. Трэба яго толькі яшчэ бліжэй пазнаць і далей пашырыць.*) Патрэба гэта сягоньня дыктуецца ня нейкім юбілейным сэнтымэнтам, а жыцьцёвай канечнасьцю. І сягоньня, як прад 40 гадамі, трэба прабівацца і да масаў людзкіх і да адзінак. Багушэвічаўскае слова шмат яшчэ можа зрабіць, бо яно ўсьцяж жывое, бо яно абвеяна німфам прароцтва нашага народнага ўваскрашэньня!

Вільня, 7.XII.30

*) Для лепшага зразуменьня творчасьці Багушэвіча кожны хай прачытае вельмі цікавую і цэнную кніжку Ад. Станкевіча: Franciš Bahušewič, jaho žyćcio i tworčaść" (крытычны нарыс) Цана 60 грашэй Галоўны склад у кнігарні „Пагоня", Вільня, Людвісарская 1

З Вільні.

Эпідэмія грыпы. У Вільні ў сучасны мамэнт вельмі многа людзей хварэе на грыпу. Хворых налічваецца каля 15 тысяч асоб.

Безрабоцьце ўсё расьце. Паводле ўрадавага аблічэньня ў Вільні налічываецца 2865 безработных. У параўнаньні з мінулым тыдням лік безработных павялічыўся на 353 асобы.

Рэдактар Янка Пазьняк.
Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня.
Выдавец Янка Шутовіч